# ІНФАРМАЦЫЯ АДНОСНА ПРЫНЦЫПАЎ І СПОСАБУ ГАЛАСАВАННЯ

**Выбары ў Еўрапейскі парламент на тэрыторыі Чэшскай Рэспублікі**
**пятніца 24-га траўня 2019 года пачынаючы з 14.00 гадзін і да 22.00 гадзін**
**субота 25-га траўня 2019 года пачынаючы з 08.00 гадзін і да 14.00 гадзін**

**Выбаршчыкам з'яўляецца**

- ✓ грамадзянін Чэшскай Рэспублікі (ЧР), які хаця б 25-га траўня 2019 гады дасягне ўзросту 18 гадоў,
- ✓ грамадзянін іншай дзяржавы - члена Еўрапейскага Саюза (ЕС), які хаця б 25-га траўня 2019 гады дасягне ўзросту 18 гадоў і з'яўляецца мінімальна пачынаючы з 10-га красавіка 2019 года прапісаным (зарэгістраваным) для пастаяннага альбо часовага пражывання на тэрыторыі Чэшскай Рэспублікі (ЧР).

**Выбаршчык можа галасаваць толькі ў тым выпадку, калі ён з'яўляецца запісаным у пераліку выбаршчыкаў для выбараў у Еўрапейскі парламент (ЕП) і**

- ✓ ягоная свабода не з'яўляецца абмежаванай па прычыне аховы здароўя
- ✓ ягоная прававздольнасць не з'яўляецца абмежаванай у дачыненні да выканання выбарчага права.

**Галасаванне адбываецца толькі на тэрыторыі Чэшскай Рэспублікі (ЧР) на выбарчых участках.**

## Вызначэнне ідэнтычнасці

Выбаршчык павінен на выбарчым участку пацвердзіць сваю ідэнтычнасць і свае грамадзянства. Грамадзянін Чэшскай Рэспублікі (ЧР) ажыццявіць гэта з дапамогай сапраўднага ўнутранага пашпарта грамадзяніна, сапраўднага замежнага, дыпламатычнага альбо службовага пашпарта Чэшскай Рэспублікі, ці ж пасведчання дзеля падарожжаў. Грамадзянін іншай дзяржавы - члена Еўрапейскага Саюза (ЕС) зробіць гэта, напрыклад, з дапамогай пасведчання аб дазволе на пастаяннае месца жыхарства ў краіне, замежнага пашпарта альбо ўнутранага пашпарта грамадзяніна.

**У тым выпадку, калі выбаршчык не пацвердзіць свае ідэнтычнасць і грамадзянства, яму не будзе дадзена магчымасць ажыццявіць галасаванне.**

## Выбарчыя бюлетэні

Выбарчыя бюлетэні з'яўляюцца надрукаванымі самастойна (асобна) для кожнага суб'екта, які з'яўляецца кандыдатам. На кожным выбарчым бюлетэні указваецца нумар суб'екта, які з'яўляецца кандыдатам, прычым дадзены нумар вызначаецца па жэрабю. Прадастаўленыя выбарчыя бюлетэні не абавязкова складаюць поўны лічбавы шраг, у тым выпадку, калі які-небудзь спіс кандыдатаў не быў зарэгістраваны нават на падставе перагляду справы з боку суда. Таксама парадкавы нумар кандыдата, які быў выкрэслены пры рэгістрацыі, застаецца на выбарчым бюлетэні незанятым.

Дадзеныя аб членстве кандыдатаў у палітычных партыях і палітычных рухах паказваюцца на выбарчым бюлетэні ў выглядзе абрэвіятуры; пералік абрэвіятур з'яўляецца складовай часткай набору выбарчых бюлетэняў.

## Адмова ад выстаўлення кандыдатуры альбо адкліканне кандыдата

На выбарчым участку публікуецца інфармацыя аб магчымай адмове ад выстаўлення кандыдатуры, адкліканні кандыдата альбо аб тым, што кандыдат - грамадзянін іншай дзяржавы - члена Еўрапейскага Саюза (ЕС) быў у сваёй дзяржаве паходжання пазбаўлены права быць абраным. Прыярытэтныя галасы, якія былі аддадзены за такога кандыдата, не прымаюцца да ўвагі.

## Спосаб галасавання

Выбаршчык атрымае ад участковай выбарчай камісіі пусты афіцыйны канверт, на якім прастаўленая афіцыйная пячатка. Камісія на падставе патрабавання выдасць яму і набор выбарчых бюлетэняў.

З афіцыйным канвертам і выбарчымі бюлетэнямі выбаршчык ўвойдзе ў прастору, якая прызначана для афармлення выбарчых бюлетэняў. Тут ён выбярэ для сябе выбарчы бюлетэнь суб'екта, які балатуецца, і якому ён хоча аддаць свой выбарчы голас.

**На выбраным выбарчым бюлетэні выбаршчык можа максамально двум кандыдатам даць прэферэнцыйны голас. Ён зробіць гэта такім чынам, што абвядзе кружочкам іх парадкавы нумар.** У тым выпадку, калі выбаршчык адзначыць кружочкам больш, чым двух кандыдатаў, не будзе прымацца пад увагу ні адзін з пераважных галасоў.

Іншыя віды афармлення выбарчага бюлетэня не аказваюць уплыву на ягоны разгляд. Пасля гэтага выбаршчык укладзе выбарчы бюлетэнь у афіцыйны канверт.

**Выбаршчык павінен быў бы пры ўкладванні выбарчага бюлетэня ў афіцыйны канверт звярнуць увагу на тое, каб па памылцы не ўкласці ў афіцыйны канверт (напрыклад, па прычыне склейвання) большай колькасці выбарчых бюлетэняў. Справа ў тым, што ў такім выпадку гаворка б ішла аб несапраўдным голасе выбаршчыка.**

Несапраўднымі таксама з'яўляюцца выбарчыя бюлетэні, якія не надрукаваныя на бланку вызначанага ўзору, далей выбарчыя бюлетэні, якія парваныя, і выбарчыя бюлетэні, якія не ўкладзеныя ў афіцыйны канверт.

## Галасаванне

**Кожны выбаршчык галасуе асабіста, не з'яўляецца дапушчальным галасаванне іншай асобай ад імя выбаршчыка.** Выбаршчык галасуе такім чынам, што афіцыйны канверт з абраным выбарчым бюлетэнем укладзе ў прысутнасці участковай выбарчай камісіі ў выбарчую скрыню.

З выбаршчыкам, які па прычыне цялеснага дэфекту не можа выбраць альбо аформіць выбраны выбарчы бюлетэнь, ці ж не можа чытаць альбо пісаць, у прасторы, прызначанай для афармлення выбарчых бюлетэняў, можа прысутнічаць іншы выбаршчык, які, аднак, ні ў якім разе не можа быць членам участковай выбарчай камісіі; дадзены выбаршчык можа за вышэйзгаданага выбаршчыка выбарчы бюлетэнь аформіць і ўкласці ў афіцыйны канверт, а таксама ў выпадку неабходнасці і ўкласці афіцыйны канверт у выбарчую скрыню.

**Выбаршчыку, які не ўнесены ў пералік выбаршчыкаў для выбараў у Еўрапейскі парламент, участковая выбарчая камісія не прадаставіць магчымасць прагаласаваць.** Дадзенае правіла не дзейнічае ў тым выпадку, калі выбаршчык галасуе на падставе пасведчання выбаршчыка, ці ж калі ён прадаставіць пацвярджэнне аб тым, што ён быў выкрэслены з адмысловага спісу выбаршчыкаў, які вядзецца прадстаўнічым (дыпламатычным) дэпартаментам, ці ж пацверджанне аб выкрэсліванні з пераліку выбаршчыкаў для выбараў у Еўрапейскі парламент у сувязі са зменай месца пастаяннага жыхарства, і таксама дакажа сваё права галасаваць на выбарчым участку.

## Галасаванне на падставе пасведчання выбаршчыка

У тым выпадку, калі выбаршчык галасуе на падставе пасведчання выбаршчыка, ён абавязаны перадаць яго участковай выбарчай камісіі. Ад камісіі ён потым атрымае пусты афіцыйны канверт, на якім прастаўленая афіцыйная пячатка, і таксама атрымае поўны набор выбарчых бюлетэняў. З пасведчаннем выбаршчыка можна галасаваць на якім заўгодна выбарчым участку.

## Галасаванне ў пераносную выбарчую скрыню

Выбаршчык на падставе сур'ёзных прычын, у прыватнасці, звязаных са станам здароўя, можа звярнуцца ў муніцыпальны дэпартамент, а ў дні выбараў - ў сваю ўчастковую выбарчую камісію з просьбай аб тым, каб ён мог прагаласаваць па-за памяшканнем выбарчага ўчастка ў пераносную

выбарчую скрыню. Аднак участковая выбарчая камісія можа выслаць сваіх членаў з пераноснай выбарчай скрыняй толькі ў рамках свайго выбарчага ўчастка.

## Інфармацыя на выбарчым участку

На выбарчым участку ў распараджэнні выбаршчыкаў будзе знаходзіцца выбарчы закон нумар 62/2003 Зб. (Зборнік заканадаўчых актаў Чэшскай Рэспублікі), а менавіта, на чэшскай, англійскай, французскай і нямецкай мовах. Далей будзе знаходзіцца ў распараджэнні і дадзеная інфармацыя на ўсіх мовах дзяржаў - членаў Еўрапейскага Саюза (ЕС).

Прыкладныя ўзоры выбарчых бюлетэняў і інфармацыя аб магчымых друкарскіх памылках на выбарчым бюлетэні з'яўляюцца выстаўленымі на выбарчым участку.